*В. М. Белакурскі,*
*кандыдат філасофскіх навук,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў,*
*Ж. Я. Белакурская,*
*кандыдат філалагічных навук,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

# РОДНАЯ МОВА ЯК ДАМІНАНТА НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАГА САМАВЫЗНАЧЭННЯ СОЦЫУМУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Усебаковае асэнсаванне імператываў нацыянальна-культурнай ідэнтыфікацыі ва ўмовах пераходнага стану сучаснага беларускага соцыуму набывае асобую актуальнасць. Звяртаючыся да феномена ідэнтыфікацыі, заходні даследчык Э. Сміт заўважае, што «чалавек вызначае сам сябе ў адпаведнасці з нацыянальнай ідэяй, праз сваю сувязь з продкамі і папярэднікамі, а таксама са з’явамі, якія сфарміравалі іх светаразуменне» [1, с. 31].

На сённяшні час тэарэтычнае абгрунтаванне і практычнае вырашэнне праблем культуры, фарміравання асобасных якасцей сталі той дамінантай, якая павінна вызначыць не толькі найбольш эфектыўную мадэль эканомікі, але і далейшы шлях развіцця ўсяго грамадства ў цэлым. Гэта патрабуе, у сваю чаргу, глыбокага аналізу традыцый «духоўнасці» – унікальнай здольнасці пакаленняў ствараць новыя сэнсы шляхам захавання мінулага вопыту і культуры, умення паставіць сябе ва ўзаемасувязь часоў, дзякуючы «намаганню чалавека быць» (М. Мамардашвілі).

Культура, як вядома, належыць да ліку тых грамадскіх з’яў, сутнасць якіх цяжка выразіць у нейкіх пэўных, жорстка фіксаваных, пачуццёва ўспрымальных формах. Сутнасць культуры можа быць раскрыта толькі шляхам аналізу, які ўключае працэс яе ўзнікнення, функцыянавання і развіцця ў бесперапынным адзінстве з чалавекам. Пры такім падыходзе ўзаемадзеянне асобы і культуры паўстае як частка цэлага ў адзінай сетцы сацыяльных адносін, той рэальнасці, у якой асоба атрымлівае магчымасць рэалізаваць сваю грамадскую сутнасць, спараджаць і ўзнаўляць сістэму адносін праз сваю працу, свае ўчынкі, спосабы зносін з іншымі.

Асновай фарміравання і развіцця культуры, яе субстанцыяй з'яўляецца дзейнасць. У працэсе дзейнасці людзі назапашваюць

уменні, веды, жыццёвы вопыт. Сацыялізацыя індывіда прадвызначае авалоданне гэтым назапашаным соцыумам багаццем. На працягу засваення і прымнажэння культуры як сродку ў людзей фарміруецца другі яе пласт – культура як спосаб самасвядомасці, самарэалізацыі, фарміравання найвышэйшых каштоўнасцей і ідэалаў. У выніку гэтага ўтвараюцца ўяўленні аб належным як аб спосабе быцця, аб каштоўнасцях і ідэалах, найбольш адэкватных усведамляемай у дадзенай культуры чалавечай сутнасці. Уяўленне аб належным, у сваю чаргу, уздзейнічае на фарміраванне, пастаноўку і рэалізацыю чалавечых каштоўнасцей. Сягоння менавіта яны, у залежнасці ад таго, у якой ступені суб’ект імі пранікся, вызначаюць яго выбар сярод рэальных ці ўяўных магчымасцей.

Культура, такім чынам, – гэта гістарычна выпрацаваныя спосабы дзейнасці соцыуму і прадукты гэтай дзейнасці, якія валодаюць пазітыўна-каштоўнаснай значнасцю для яго развіцця. У спосабах дзейнасці, якія склаліся ў культурным пласце, адлюстраваны аб’ектыўныя ўласцівасці, сувязі і законы акаляючага свету. Гэтыя аб’ектыўныя ўласцівасці, прычыны, законы, што ўвасабляюцца ў спосабах дзейнасці канкрэтнага соцыуму шляхам назапашвання і адбору вопыту, ствараюць унікальны і непаўторны «малюнак» яго роднай культуры, замацаваны знакам – «сацыяльным генам» – пазабіялагічнага атрымання ў спадчыну. Аднак культурнае багацце, назапашанае канкрэтным соцыумам у прадметнай форме, не можа само па сабе служыць гарантыяй росквіту яго будучых пакаленняў. Калі грамадства па тых ці іншых прычынах не стымулюе адпаведныя адносіны да культуры, калі індывіды не авалодваюць усім спектрам напрацаваных іх папярэднікамі ведаў і спосабаў дзейнасці, не развіваюць іх ці авалодваюць імі аднамерна, грамадства культурна бяднее, губляе свае жыццёвыя сілы. Паколькі ў чалавека не сфарміраваны ці недаразвіты сацыяльна-культурныя якасці, няма адпаведных патрэб, няма свядомай устаноўкі на засваенне культурна-выхаваўчых фактараў, апошнія застаюцца знешнімі і бяздзейнымі ў адносінах да яго. Акрамя таго, чалавек не можа быць проста аб’ектам уздзеяння выхаваўчых фактараў, ён павінен выступаць суб’ектам самаразвіцця.

У сучасным грамадстве ўсё часцей заяўляюць аб сабе антыкультурна-тармозячыя сілы. Адсюль вынікае, што культура як духоўная арыентацыя чалавека на рэалізацыю сваёй родавай сутнасці заяўляе аб сабе праз супрацьстаянне, супрацьборства з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

антыкультурай. У такім аспекце культура можа быць адэкватна рэалізавана толькі як гістарычная перавага вышэйшых духоўных арыентацый, тых, якія выражаюць самую глыбінную сутнасць чалавека і соцыуму. Да такіх вышэйшых арыенціраў, імператываў нацыянальна-культурнай ідэнтыфікацыі належыць родная мова як «генетычная памяць» і «дом быцця» (М. Хайдэгер) [3, с.192].

Практыка сведчыць аб тым, што індывід, пазбаўлены роднай мовы, не можа ўзняцца да ўзроўню суб'екта свайго ўласнага культурнага развіцця. У значнай ступені гэта адносіцца і да соцыуму ў цэлым, паколькі ў роднай мове канкрэтнага соцыуму «прагаворваецца» культурная спадчына. Мова як носьбіт сэнсу, як аснова найбольш адэкватнага яго выражэння ў працэсе спадчыннай перадачы прадвызначае працяглы кантынуум чалавечай дзейнасці праз узыходжанне ад адзінкавых актаў да ўсеагульнага шляхам трансляцыі сацыяльнасці. Гэта сума сацыяльнасці, якая змешчана ў мове, складае змест сацыяльнай памяці. Апошняя як абагульнены калектыўны вопыт, надындывідуальная інфармацыйная сістэма ўяўляе сабой «сховішча традыцый, нямых звычак думкі» (М. Фуко) [2, с. 321] – аснову ўзнаўляльных працэсаў, іх актуалізацыі і апрадмечвання. Захаваная і выражаная ў мове культурная традыцыя паўстае як каштоўнасная выбіральная рэтраспектыва чалавечага вопыту, змястоўна «прафільтраванага» пакаленнямі, што акумулюе каштоўнасна значныя рэгулятывы для сучаснага і зыходную мадэль дзейнасці асобы, якая звернута ў будучае.

Нацыянальна-культурная ідэнтыфікацыя асобы на аснове роднай мовы дастаткова выразна заявіла пра сябе яшчэ ў эпоху беларускага Адраджэння. Аднак праз нейкі час у выніку знешнепалітычных прычын дадзены працэс быў штучна перарваны. Спароджаная гэтай сітуацыяй «дрымотнасць духу» самым негатыўным чынам адбілася на далейшым развіцці соцыуму, перманентна спараджаючы не ў адным пакаленні рэфлекс боязі, паслушэнства і канфармізму. Гэты феномен асобнымі даследчыкамі падаецца сёння як талерантнасць беларуса. Патрэбна таксама адзначыць, што тэрмін «талерантнасць» не можа адназначна разумецца толькі як «памяркоўнасць». На наш погляд, гэта, перш за ўсё, выхаваная і свядомая павага да іншага (у тым ліку, да суб’екта іншай культуры), заснаваная на аб’ектыўных ведах, пазбаўленая эмацыянальных рэакцый.

Такім чынам, дзякуючы гістарычнаму бяссіллю індывіда, які ніколі не быў суб’ектам свайго ўласнага лёсу, высілкамі палітолагаў быў створаны прыцягальны міф аб яго «прыцягальных»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вартасцях, якія апрыёры даюць надзею на поспех у вырашэнні задач сённяшняга дня. Аўтары такіх міфаў пакідаюць без увагі тое, што залежнасць ад пана, якая працягвалася сотні гадоў, затым ад партыйных чыноўнікаў разам з абшчыннай ураўняльнасцю сфарміравалі ў індывіда ўтрыманска-люмпенскія тэндэнцыі. Гэта, у сваю чаргу, дэструктыўна адлюстравалася на маральных нормах і працоўнай этыцы ўсяго соцыуму: «Забіты дух яго вякамі ўжо чуе страх перад панамі» (Я. Колас), а таксама на яго адносінах да свайго, нацыянальнага, у тым ліку да роднага слова. Мова фарміруе асобу, дзякуючы мове праяўляецца характар асобы, яе адносіны да свету. Абязлічанне наступае ва ўмовах пераймання чужога і моўнай пасіўнасці. Так, у перыяд панавання адміністрацыйна-каманднай сістэмы апошняй была спароджана «квазімова» пастаноў, рапартаў і г.д., якая адпаведным чынам рэгламентавала мысленне народа. У выніку не толькі сціраліся, знікалі з нацыянальных слоўнікаў як архаічныя многія словы, але таксама страчвалі сэнс фундаментальныя маральныя паняцці, такія, як Бог, Душа, Сумленне, Спачуванне, Гонар, Міласэрнасць. Яны выносіліся як бы «за дужкі», нібыта самі па сабе маглі мець класавы характар. Адміністрацыйная іерархія «навамовы» спарадзіла новую іерархію сацыяльнага быцця. На пярэдні план былі высунуты словы *правадыр, партыя, мэта, план, вораг, працадзень* і г. д. Такая пераацэнка слоў цягнула за сабой пераацэнку ўсяго слоўніка народа, такіх ключавых слоў культуры, як *прыгажосць, праўда, сэнс, прыхільнасць, вера, надзея, святасць,* якія на працягу стагоддзяў стваралі «аўру нацыянальнага духу», фарміравалі нацыянальныя традыцыі. «Тэктанічны зрух», які адбыўся ў мове народа, прывёў не толькі да аб'яднання яго ўнутранага свету, гэта садзейнічала страце «сувязі часоў», якая да гэтага часу не адноўлена поўнасцю.

Такім чынам, у нашай краіне, якая набыла дзяржаўнасць, у якасці нацыянальнай кансалідуючай мэты можа і павінна стаць родная мова.

1. *Сміт, Э.* Нацыяналізм у дваццатым стагоддзі : пер. з англ. / Э. Сміт. – Менск : Беларускі фонд Сораса, 1995. – 272 с.

2. *Фуко, М.* Слова и вещи. Археология гуманитарных наук : пер. с фр. / М. Фуко. – СПб. : A-cad, 1994. – 405 с.

3. *Хайдеггер, М.* Время и бытие : статьи и выступления : пер. с нем. / М. Хайдеггер. – М. : Республика, 1993. – 447 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ